# Канферэнцыі. Сімпозіумы

У.К. Слабін

## 82-і Кангрэс Амерыканскай асацыяцыі адукацыйных даследаванняў

10-14 красавіка 2001 г. у Сіэтле адбыўся штогадовы Кангрэс Амерыканскай асацыяцыі адукацыйных даследаванняў (American Educational Research Association) пад назвай «Што мы ведаем і як мы гэта ведаем» («What We Know and How We Know It»).

5 тысяч удзельнікаў прыехалі ў Сіэтл з усіх кантынентаў. Кангрэс адбываўся адначасова ў залах Гандлёвага цэнтра пасяджэнняў штата Вашынгтон, гасцініц «Шэратон» і «Уэсцін». У межах Кангрэса працавалі звычайныя і інтэрактыўныя сімпозіумы, агульныя і спецыялізаваныя секцыйныя пасяджэнні, майстэрні. У праграму былі ўключаны стэндавыя прэзентацыі, круглыя сталы, дэманстрацыі, чытацкія канферэнцыі, візіты ў іншыя адукацыйныя ўстановы горада і нават перформансы.

Практычна не засталося ніводнай педагагічнай праблемы, якая б не была абмеркавана на 1383 прадстаўленых дакладах. Бадай, найбольшая іх колькасць так ці іначай датычыла інфарматызацыі адукацыі: «Супольнасці он-лайнавага навучання ў соцыякультурным кантэксце: пяць плоскасцяў аналізу», «Шматвымерныя аспекты пабудовы он-лайнавай вучнёўскай супольнасці», «Дапамога настаўнікам у засваенні і адаптацыі вучэбных мерапрыемстваў з Інтэрнет-падтрымкай», «Геаінфармацыйныя сістэмы ў выкладанні прыродазнаўчых навук», «Адлюстраванне біяразнастайнасці з дапамогай геаінфармацыйных сістэм і BioKIDS» і інш.

Другой шырока прадстаўленай тэмай стала экалагізацыя адукацыі: «Экалагічная пісьменнасць для ўсіх студэнтаў: ацэнка стрыжнёвых прадметаў цыкла «Навакольнае асяроддзе», «Ацэнка курса «Экалагічная этыка» для 8 класа амерыканскай школы», «Канцэптуальнае разуменне экалагічнай адказнасці, ролі грамадзянскай супольнасці, лакальнай і рэгіянальнай адукацыі вучнямі», «Грамадзянская супольнасць у паляпшэнні экалагічнай адукацыі», «Маральныя ўзаемаадносіны дзіцяці з прыродай: да біяфілійнай першапрычыны страху і клопату», «Дзіцячыя канцэпцыі ўзаемаадносін людзей і жывёл», «Стратэгіі экалагічнай адукацыі на аснове прыродаахоўных акцый» і інш.

На Кангрэсе прагучалі таксама даклады, прысвечаныя адукацыі ў СНД: «Кіраванне школай у Расіі пачатку XXI ст.: разыходжанне тэорыі і практыкі» (Л. Фішман, Самарскі педуніверсітэт), «Прагрэсіўнае ў савецкай сістэме адукацыі» (А. Сідоркін, універсітэт Боўлінга, штат Вашынгтон), «Ліквідацыя непісьменнасці ў Расіі ў 20-х гг.» (Ч. Кларк, універсітэт штата Віскансін).

Значнай падзеяй форума стала кніжная выстава-кірмаш з фантастычным асартыментам літаратуры па педагогіцы і псіхалогіі. Удзел у ёй прынялі практычна ўсе амерыканскія і брытанскія выдавецтвы.

Беларусь на форуме прадстаўляў аўтар з дакладам «Інфармацыйныя тэхналогіі ў экалагічнай адукацыі» як фіналіст праграмы «Рэгіянальныя навукоўцы» (RSEP), якая фінансуецца Дзяржэпартаментам ЗША і кіруецца Амерыканскім Саветам (ACCELS) паводле пагаднення з Міністэрствам адукацыі Беларусі.